• Днямі ў НББ прадставілі тэматычную выстаўку «Старажытныя гарады Беларусі», таксама прысвечаную Году гістарычнай памяці. Экспазіцыя налічвае больш за 150 экспанатаў. Сярод іх — найлепшы навігатар па нашых землях свайго часу — факсіміле знакамітай Радзівілаўскай карты ВКЛ (1648), аўтары якой — мастак і гравёр пры двары князя Радзівіла ў Нясвіжы Тамаш Макоўскі і галандскі гравёр і картограф амстэрдамскага выдавецкага дома Блау Гесель Герытс, паведамілі арнанізатары. Прадстаўлены навуковыя працы, гістарычныя нарысы, навукова-папулярныя выданні, якія сведчаць: старажытныя гарады прайшлі няпросты шлях гістарычнага развіцця ў складзе розных дзяржаўных утварэнняў і здолелі захаваць выдатную культурную спадчыну.